*ЛІТАРАТУРА, КРЫНІЦЫ*

1. Теория и практика идеологической работы: Курс лекций / Редкол. Ж. Т. Тощенко (отв. ред.) и др. М., 1984. С. 232.
2. Советская Белоруссия. 1978. 4 янв.
3. Физкультура и спорт Белоруссии. Мн., 1982. С. 12, 129.
4. Белорусская ССР: Крат. энцикл. Мн., 1980. Т. 3. С. 45.
5. *Новицкий В. И.* Комплексный подход к воспитанию трудящихся. Мн., 1981.
6. *Филиппович В. С.* Развитие физической культуры и спорта в условиях зрелого социализма (1966—1980 гг.): Автореф. дис.... д-ра ист. наук. Мн., 1983. С. 27—29.
7. НА РБ, ф. 934, воп. 3, спр. 241, л. 1.
8. Народное хозяйство БССР в 1987 г.: Стат. ежегодник. Мн., 1988.
9. Народное хозяйство БССР в 1986 г.: Стат. ежегодник. Мн., 1987.
10. Советская Белоруссия. 1974. 30 апр.
11. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 102, воп. 44, спр. 9, л. 24—25.
12. *Чагина Е. П.* Источники силы. Мн., 1982. С. 72.
13. Архіў Белсаўпрофа, спр. 04—18, л. 11, 36, 62, 100, 120, 138.
14. *Григоревич В. В.* Физическое воспитание студенческой молодежи Белоруссии. 1966—1985 гг.: Автореф. дис. ... канд. ист. наук. Мн., 1992. С. 13, 18—19.
15. Место жительства — место воспитания / Сост. А. М. Русакович. М., 1985. С. 14.
16. Физкультурник Белоруссии. 1980. 16 янв.

*SUMMARY*

*The article analyses the physical culture development as one of the directions of state social policy and shows the ways of participation of different aged and social groups of people in physical culture activity.*

УДК 947.6

*А. П. Жытко*

# РАЗМЕРКАВАННЕ ДВАРАНСТВА БЕЛАРУСІ ПА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦІ І МЕСЦЫ НАРАДЖЭННЯ

Істотным фактарам фарміравання беларускай нацыі з'яўлялася наяўнасць высокаадукаванай нацыянальнасвядомай эліты — дваранства. Гістарычная літаратура да апошняга часу практычна адмяжоўвала вышэйшае саслоўе па нацыянальнай прыналежнасці ад беларускага народа, што падспудна паказвала яго не зусім паўнацэнным. Мы трактуем гэта як кан'юнктурна-палітычны падыход, а не аб'ектыўную канстатацыю фактаў.

Матэрыялы перапісу 1897 г. не прызнаюць такія сцвярджэнні і ўносяць істотныя карэктывы ў азначанае пытанне. Яны

дазваляюць ідэнтыфікаваць нацыянальнасць дваранства Беларусі на аснове звестак аб яго роднай мове. Пры амаль поўнай адсутнасці ў крыніцах даных аб нацыянальнай прыналежнасці такі варыянт найбольш прымальны. Родная мова — важнейшы паказчык этнічнага самаўсведамлення кожнага чалавека. Сярод патомных дваран 35 паветаў адказалі на пытанне, што іх роднай мовай з'яўляецца беларуская, г. зн., што сябе адносяць да беларусаў 77 264 чалавекі (51,8 %). Роднай мовай назвалі рускую 17 168 чалавек (11,5 %), 49 042 (32,9 %) — польскую і 5 694 (3,8 %) — іншыя мовы. Гэтыя паказчыкі істотна адрозніваліся ў сельскай мясцовасці і гарадах. Так, у паветах без гарадоў працэнт дваран-беларусаў быў яшчэ вышэйшым і склаў 60,3 % (73 809 чалавек), палякаў — 32,1 % (39 408 чалавек), а рускіх знізіўся амаль у 2,5 разы — да 4,8 % (5 857 чалавек). Беларусаў больш за ўсё пражывала ў Мінскай губерні — 39 917 чалавек (67,7 %), Віленскай — 16988 (57,8 %) і Магілёўскай губерні — 10 481 (61,5 %). Палякі складалі большасць у 5 паветах Віцебскай (4 575 чалавек, альбо 47,7 %) і 6 паветах Гродзенскай губерняў (3 673, альбо 48,8 %). Дваран-беларусаў тут, адпаведна, пражывала 4 457 (46,5 %) і 1 966 (26,1 %) чалавек. Доля рускіх вагалася ад 3,1 % у Віленскай і Мінскай да 19,3 % у Гродзенскай губернях [1].

Патомныя дваране-беларусы абсалютна (звыш 50 % ад агульнай колькасці) пераважалі ва ўсіх 4 беларускіх паветах Віленскай губерні, у 2 паветах (Дрысенскі, Полацкі) з 5 Віцебскай, у адным (Гродзенскім) з 6 Гродзенскай, ва ўсіх, за выключэннем Навагрудскага, паветах Мінскай і ў 8 з 11, акрамя Гомельскага, Аршанскага і Сенненскага паветаў Магілёўскай губерні. Такім чынам, у 23 (65,7 %) з 35 паветаў большасць патомных дваран назвалі роднай мовай беларускую [1].

Суадносіны паміж прадстаўнікамі вышэйшага саслоўя па нацыянальнай прыкмеце істотна змяніліся ў гарадах у параўнанні з сельскай мясцовасцю. Так, сярод гарадскога набілітэту беларусы былі прадстаўлены ў колькасці толькі 3 455 чалавек (13,0 %). Тут дамінавалі рускія 11 311 чалавек (42,4 %) і палякі 9 634 (36,1 %). Доля беларускіх патомных дваран была найменшай у гарадах Віцебскай губерні (8,1 %) і найбольшай у Віленскай губерні (28,5 %) [1].

Увядзенне пасля 1863 г. абмежаванняў пры прыёме на службу мясцовых прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя, асабліва каталіцкага веравызнання, абумовіла тое, што сярод асабовых дваран і чыноўнікаў пераважалі рускія, якіх прываблівалі вялікімі грашыма за службу ў «заміраным» краі. «Грошы — вось чым замест ідэйнасці і патрыятычнага служэння інтарэсам імперыі пачалі заахвочваць Мураўёў і Карнілаў расійскае настаўніцтва і чыноўніцтва... Праграма "обрусения Белоруссии" з гэтага моманту вызначылася не як культурнае ці нацыянальнае заданне, а як вузка эканамічны, шкурны інтарэс тых "дзеячаў", што пачалі з 1864 года ехаць на Беларусь на цёплыя месцы, за падвойныя

пенсіі, узнагароды, пад'ёмныя, ордэны і г. д.», — справядліва адзначаў А. Цвікевіч [2, с. 66].

Варта ўлічваць факт, што афіцыйнай мовай была прызнана руская. Валоданне рускай мовай з'яўлялася адным з патрабаванняў пры паступленні на службу. Менавіта таму адна частка служылых мясцовых дваран адмовілася ад беларускай мовы, або проста ёй не карысталася, другая вымушана была рабіць кар'еру за межамі Беларусі, звычайна ва ўнутраных раёнах імперыі. Безумоўна, гэта адбілася на нацыянальным складзе асабовых дваран і чыноўнікаў. Сярод дадзенай катэгорыі беларусаў у 35 паветах налічвалася толькі 6 479 чалавек (25,9 %). Абсалютную і адносную большасць складалі рускія — 12 695 чалавек (50,7 %). Палякаў налічвалася 4 685 чалавек (18,7 %), а прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў — 1 181 (4,7 %). У сельскай мясцовасці, дзе адміністрацыя мела непасрэднае дачыненне да беларускага насельніцтва і дзе рускія чыноўнікі служылі з неахвотай, доля беларусаў была значна большай. У 35 паветах без гарадоў асабовых дваран-беларусаў і чыноўнікаў налічвалася 4 097 чалавек (43,0 %), рускіх — 2684 (28,2 %), палякаў — 2386 (25,1 %). У Магілёўскай і Мінскай губернях прадстаўніцтва беларусаў перавышала 50 %, што склала, адпаведна, 945 (55,4 %) і 1 517 (50,5 %) чалавек. Блізкай да гэтай прапорцыі была колькасць беларусаў у Віленскай (48,6 %) і Віцебскай (45,2 %) губернях. Толькі ў Гродзенскай губерні рускія пераважалі абсалютна (1 010 чалавек) і адносна (60,4 %) [1].

У губернскіх і павятовых гарадах лідзіравалі толькі рускія — 10 012 чалавек (64,5 %). Іх колькасць вагалася ў Магілёўскай ад 57,7 % да 70,1 %, у Віленскай губерні доля беларусаў і палякаў была амаль аднолькавай — 15,3 % і 14,8 %. Толькі ў 5 гарадах краю пераважалі асабовыя дваране-беларусы і чыноўнікі (Клімавічы, Мсціслаўль, Сенна, Сураж і Чэрыкаў [1]).

У гістарычнай літаратуры, публіцыстыцы XIX ст. разгарэліся спрэчкі, якія працягваюцца і па сённяшні дзень, аб паходжанні дваран Беларусі. У польскай і велікарускай гістарыяграфіі дваран-католікаў пераважна адносілі да выхадцаў з Царства Польскага ці апалячаных беларусаў. Дваран праваслаўнага веравызнання прылічвалі да рускіх. Аднак матэрыялы перапісу 1897 г. уносяць карэктывы ў такія неабгрунтаваныя сцвярджэнні. Так, на аснове перапісу ў 35 паветах пражывала 94 030 чалавек (76,7 %) мясцовых патомных дваран. Калі да гэтай лічбы дадаць і ўраджэнцаў іншых паветаў беларускіх губерняў, то польскасць мясцовых дваран складзе 108 349 чалавек (88,4 %). Ураджэнцы іншых губерняў і замежных дзяржаў складалі толькі 11,6 % ад агульнай колькасці патомных дваран Беларусі [3]. Нават у гарадах мясцовыя ўраджэнцы таксама пераважалі. На іх долю прыпадала 60,5 % патомных дваран-гараджан. Некалькі ніжэйшым быў працэнт мясцовых асабовых дваран і чыноўнікаў у паветах без гарадоў. Ён склаў 74,8 %. У гарадах іх пражывала 5 605 чалавек (64,3 %) [3].

*Табліца 1*

**Размеркаванне патомных дваран 35 паветаў па месцы нараджэння (нерапіс 1897 г.) [3]**

| Месца нараджэння: паветы, гарады | Ураджэнцы мясцовыя | | | | | | Ураджэнцы іншых паветаў губерні | | | | | | Ураджэнцы іншых губерняў | | | | | | Ураджэнцы іншых дзяржаў | | | | | | Разам | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Мужчыны | | Жанчыны | | Усяго | | Мужчыны | | Жанчыны | | Усяго | | Мужчыны | | Жанчыны | | Усяго | | Мужчыны | | Жанчыны | | Усяго | | Мужчыны | Жанчыны | Усяго |
| | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | Колькасць | Колькасць |
| *Віленская губерня (4 паветы)* | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| У паветах | 12424 | 81,9 | 12702 | 80,5 | 25126 | 81,1 | 1041 | 6,9 | 1172 | 7,4 | 2213 | 7,2 | 1697 | 11,2 | 1891 | 12,0 | 3588 | 11,6 | 5 | 0,0 | 14 | 0,1 | 19 | 0,1 | 15167 | 15799 | 30966 |
| З іх у гарадах | 449 | 63,2 | 562 | 65,6 | 1011 | 64,6 | 65 | 9,1 | 66 | 7,7 | 131 | 8,4 | 196 | 27,6 | 224 | 26,2 | 420 | 26,8 | 1 | 0,1 | 3 | 0,4 | 4 | 0,2 | 711 | 855 | 1566 |
| *Віцебская губерня (5 паветаў)* | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| У паветах | 3630 | 57,6 | 3901 | 59,3 | 7531 | 58,5 | 909 | 14,4 | 1028 | 15,6 | 1937 | 15,0 | 1753 | 27,8 | 1637 | 24,9 | 3390 | 26,3 | 13 | 0,2 | 12 | 0,2 | 25 | 0,2 | 6305 | 6578 | 12883 |
| З іх у гарадах | 428 | 26,2 | 580 | 34,8 | 1008 | 30,5 | 311 | 19,1 | 401 | 24,0 | 712 | 21,6 | 885 | 54,3 | 882 | 40,9 | 1567 | 47,5 | 7 | 0,4 | 6 | 0,3 | 13 | 0,4 | 1631 | 1669 | 3300 |
| *Гродзенская губерня (6 паветаў)* | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| У паветах | 2837 | 48,0 | 3052 | 47,9 | 5889 | 48,0 | 730 | 12,4 | 1036 | 16,3 | 1766 | 14,4 | 2325 | 39,4 | 2145 | 33,7 | 4470 | 36,4 | 10 | 0,2 | 135 | 2,1 | 145 | 1,2 | 5902 | 6367 | 12269 |
| З іх у гарадах | 620 | 27,8 | 871 | 34,6 | 1491 | 31.5 | 344 | 15,5 | 491 | 19,5 | 835 | 17,0 | 1660 | 56,6 | 1131 | 45,0 | 2391 | 50,4 | 2 | 0,1 | 21 | 0,8 | 23 | 0,5 | 2226 | 2514 | 4740 |
| *Магілёўская губерня* | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| У паветах | 6530 | 62,2 | 7399 | 63,9 | 13929 | 63,0 | 1751 | 16,6 | 1678 | 14,5 | 3429 | 15,0 | 3890 | 11,2 | 4354 | 12,0 | 8244 | 11,6 | 21 | 0,1 | 78 | 0,2 | 99 | 0,1 | 34754 | 36220 | 70974 |
| З іх у гарадах | 684 | 29,4 | 1369 | 50,4 | 2053 | 40,7 | 692 | 29,8 | 308 | 11,3 | 1000 | 19,0 | 1962 | 34,9 | 2153 | 33,6 | 4115 | 34,3 | 5 | 0,1 | 33 | 0,5 | 38 | 0,3 | 5611 | 6403 | 12014 |
| *Мінская губерня* | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| У паветах | 25671 | 73,8 | 26547 | 73,3 | 52218 | 73,6 | 5172 | 14,9 | 5241 | 14,5 | 10413 | 14,0 | 2223 | 21,1 | 2462 | 21,3 | 4685 | 21,2 | 13 | 0,1 | 40 | 0,3 | 53 | 0,2 | 10514 | 11576 | 22090 |
| З іх у гарадах | 2344 | 41,8 | 2756 | 43,1 | 5100 | 42,4 | 1300 | 23,2 | 1461 | 22,8 | 2761 | 23,0 | 943 | 40,6 | 1027 | 37,8 | 1970 | 39,1 | 5 | 0,2 | 14 | 0,5 | 19 | 0,4 | 2324 | 2718 | 5042 |
| *Разам* | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| У паветах | 51092 | 70,3 | 53601 | 70,0 | 104693 | 70,2 | 9603 | 13,2 | 10155 | 13,3 | 19758 | 13,0 | 11888 | 16,4 | 12489 | 16,3 | 24377 | 16,3 | 62 | 0,1 | 279 | 0,4 | 341 | 0,2 | 72642 | 76540 | 149182 |
| З іх у гарадах | 4525 | 36,2 | 6138 | 43,4 | 10663 | 40,0 | 2712 | 21,7 | 2727 | 19,3 | 5439 | 20,5 | 5246 | 41,9 | 5217 | 36,8 | 10463 | 39,2 | 20 | 0,2 | 77 | 0,5 | 97 | 0,4 | 12503 | 14159 | 26662 |
| У паветах без гарадоў | 46567 | 77,4 | 47463 | 76,1 | 94030 | 76,7 | 6891 | 11,5 | 7428 | 11,9 | 14319 | 11,0 | 6642 | 11,0 | 7272 | 11,7 | 13914 | 11,4 | 42 | 0,1 | 202 | 0,3 | 244 | 0,2 | 60139 | 62381 | 122520 |

*Табліца 2*

## Размеркаванне асабовых дваран і чыноўнікаў не з дваран па месцы нараджэння (перапіс 1897 г.) [3]

| Месца нараджэння: паветы, гарады | Ураджэнцы мясцовыя | | | | | | Ураджэнцы іншых паветаў губерні | | | | | | Ураджэнцы іншых губерняў | | | | | | Ураджэнцы іншых дзяржаў | | | | | | Разам | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Мужчыны | | Жанчыны | | Усяго | | Мужчыны | | Жанчыны | | Усяго | | Мужчыны | | Жанчыны | | Усяго | | Мужчыны | | Жанчыны | | Усяго | | Мужчыны | Жанчыны | Усяго |
| | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | % | Колькасць | Колькасць | Колькасць |
| *Віленская губерня (4 паветы)* | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| У паветах | 267 | 51,8 | 305 | 58,3 | 572 | 55,1 | 75 | 14,5 | 63 | 12,0 | 138 | 13,3 | 174 | 33,7 | 155 | 29,7 | 329 | 31,6 | — | — | — | — | — | — | 516 | 523 | 1039 |
| З іх у гарадах | 43 | 28,6 | 50 | 35,2 | 93 | 31,8 | 22 | 14,7 | 31 | 21,8 | 53 | 18,2 | 85 | 56,7 | 61 | 43,0 | 146 | 50,0 | — | — | — | — | — | — | 150 | 142 | 292 |
| *Віцебская губерня (5 паветаў)* | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| У паветах | 1159 | 44,8 | 1315 | 47,2 | 2474 | 46,0 | 532 | 20,6 | 656 | 23,5 | 1188 | 22,1 | 891 | 34,4 | 807 | 28,9 | 1698 | 31,6 | 5 | 0,2 | 11 | 0,4 | 16 | 0,3 | 2587 | 2789 | 5376 |
| З іх у гарадах | 436 | 29,3 | 580 | 35,4 | 1016 | 32,6 | 371 | 25,0 | 460 | 28,1 | 831 | 26,6 | 676 | 45,5 | 590 | 36,1 | 1266 | 40,5 | 3 | 0,2 | 7 | 0,4 | 10 | 0,3 | 1486 | 1637 | 3123 |
| *Гродзенская губерня (6 паветаў)* | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| У паветах | 682 | 26,8 | 808 | 34,7 | 1490 | 30,6 | 457 | 18,0 | 464 | 19,9 | 921 | 18,9 | 1395 | 54,8 | 1036 | 44,5 | 2431 | 49,9 | 11 | 0,4 | 20 | 0,9 | 31 | 0,6 | 2545 | 2328 | 4873 |
| З іх у гарадах | 434 | 26,1 | 535 | 34,8 | 969 | 30,3 | 326 | 19,6 | 318 | 20,6 | 644 | 20,1 | 894 | 53,9 | 677 | 43,9 | 1571 | 49,1 | 6 | 0,4 | 11 | 0,7 | 17 | 0,5 | 1660 | 1541 | 3201 |
| *Магілёўская губерня* | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| У паветах | 1317 | 42,0 | 1877 | 60,0 | 3194 | 51,0 | 897 | 28,6 | 515 | 16,5 | 1412 | 22,5 | 1431 | 38,4 | 1079 | 30,5 | 2510 | 34,5 | 4 | 0,1 | 12 | 0,3 | 16 | 0,2 | 3722 | 3546 | 7268 |
| З іх у гарадах | 664 | 33,3 | 1074 | 56,9 | 1738 | 44,8 | 630 | 31,6 | 267 | 14,1 | 897 | 23,1 | 1066 | 47,9 | 826 | 40,4 | 1892 | 44,3 | 3 | 0,1 | 11 | 0,5 | 14 | 0,3 | 2223 | 2047 | 4270 |
| *Мінская губерня* | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| У паветах | 1481 | 39,8 | 1685 | 47,5 | 3166 | 43,6 | 806 | 21,7 | 770 | 21,7 | 1576 | 21,7 | 913 | 29,1 | 731 | 23,4 | 1644 | 26,2 | 6 | 0,2 | 7 | 0,2 | 13 | 0,2 | 3133 | 3130 | 6263 |
| З іх у гарадах | 657 | 29,6 | 758 | 37,0 | 1415 | 33,2 | 497 | 22,4 | 452 | 22,1 | 949 | 22,2 | 696 | 34,9 | 540 | 28,6 | 1236 | 31,9 | 3 | 0,2 | 6 | 0,3 | 9 | 0,2 | 1993 | 1887 | 3880 |
| *Разам* | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| У паветах | 4906 | 39,2 | 5990 | 48,7 | 10896 | 43,9 | 2767 | 22,1 | 2468 | 20,0 | 5235 | 21,1 | 4804 | 38,5 | 3808 | 30,9 | 8612 | 34,7 | 26 | 0,2 | 50 | 0,4 | 76 | 0,3 | 12503 | 12316 | 24819 |
| З іх у гарадах | 2234 | 29,7 | 2997 | 41,3 | 5231 | 35,4 | 1846 | 24,6 | 1528 | 21,1 | 3374 | 28,9 | 3417 | 45,5 | 2694 | 37,1 | 6111 | 41,4 | 15 | 0,2 | 35 | 0,5 | 50 | 0,3 | 7512 | 7254 | 14766 |
| У паветах без гарадоў | 2672 | 53,5 | 2993 | 59,1 | 5665 | 56,3 | 921 | 18,5 | 940 | 18,6 | 1861 | 18,5 | 1387 | 27,8 | 1114 | 22,0 | 2501 | 24,9 | 11 | 0,2 | 15 | 0,3 | 26 | 0,3 | 4991 | 5062 | 10053 |

Такім чынам, абсалютную большасць як патомных, так і асабовых дваран складалі ўраджэнцы Беларусі.

Параўнальная характарыстыка патомных дваран па нацыянальным складзе і месцы нараджэння дае падставу заўважыць заканамернасць: у губернях з вышэйшым працэнтам мясцовых ураджэнцаў — вышэйшая і адносная колькасць дваран-беларусаў і наадварот.

Падобная з'ява назіраецца з асабовымі дваранамі і чыноўнікамі, за выключэннем Мінскай і Віцебскай губерняў, дзе разыходжанні нязначныя.

*Табліца 3*

**Адноснае размеркаванне патомных дваран па месцы нараджэння і нацыянальнасці (35 паветаў) [1; 3]**

| *Губерні* | *% дваран, ураджэнцаў губерні* | *% дваран-беларусаў* |
|---|---|---|
| Віленская | 87,7 | 56,3 |
| Віцебская | 74,3 | 36,7 |
| Гродзенская | 62,3 | 20,3 |
| Магілёўская | 79,5 | 52,4 |
| Мінская | 88,0 | 57,8 |

*Табліца 4*

**Адноснае размеркаванне асабовых дваран і чыноўнікаў па месцы нараджэння і нацыянальнасці (35 паветаў) [1; 3]**

| *Губерні* | *% дваран, ураджэнцаў губерні* | *% дваран-беларусаў* |
|---|---|---|
| Віленская | 68,4 | 37,4 |
| Віцебская | 68,1 | 24,4 |
| Гродзенская | 49,5 | 11,0 |
| Магілёўская | 65,3 | 25,7 |
| Мінская | 73,5 | 38,4 |

Такім чынам, дваране-беларусы былі мясцовага паходжання. Калі ўлічыць, што абсалютная большасць з іх з'яўлялася католікамі па веравызнанні, то і носьбітамі нацыянальнай самасвядомасці ў асноўным выступалі дваране-католікі, а не праваслаўныя. Апошнія прадстаўлялі сабой вышэйшую мясцовую адміністрацыю і часткова буйных землеўласнікаў. Але велікарускае землеўладанне ў краі ў значнай меры было фіктыўным. Прадстаўнікі яго не маглі адыграць ролю нацыянальнасвядомай беларускай эліты.

Дваране-католікі па веравызнанні і па роднай мове (польскай) не з'яўляліся ў прамым сэнсе палякамі. Гэта хутчэй за ўсё апалячаная ў сілу спецыфічных гістарычных і палітычных умоў частка беларускага набілітэту. Даследчык Віцебскай губерні А. Семянтоўскі зрабіў выснову, што «ў строгім сэнсе прыродных палякаў, што прыйшлі ў Віцебскую губерню з Польшчы, вельмі няшмат; большая частка так званых палякаў, нават сярод дваранства, гэта нашчадкі некалі праваслаўных беларусаў, якія ў эпоху ганенняў праваслаўя ў належаўшых Польшчы правінцыях спакусіліся ў лацінства, а потым адверглі родную мову пад уплывам каталіцкага святарства... і апалячыліся» [2, с. 22].

*ЛІТАРАТУРА*


1. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. IV. Віленская губерния. Тетр. 3. СПб., 1904. С. 164—168; V. Витебская губерния. Тетр. 3. СПб., 1903. С. 256—268; XI. Гродненская губерния. СПб., 1904. С. 290—292, 298, 300, 302, 304; XXII. Минская губерния. СПб., 1903. С. 224—244; XXIII. Могилевская губерния. СПб., 1903. С. 250—264.
2. *Цьвікевіч А.* «Западно-русізм»: Нарысы з гісторыі грамадзянскай мыслі на Беларусі ў XIX ст. і пачатку XX ст. Мн., 1993.
3. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. IV. Віленская губерния. Тетр. 2. С. 96—103; V. Витебская губерния. Тетр. 1. С. 98—107; XI. Гродненская губерния. С. 44—45; XXII. Минская губерния. С. 40—41; XXIII. Могилевская губерния. С. 40—41.
4. *Сементовский А.* Этнографический обзор Витебской губернии. СПб., 1872.



SUMMARY

*The author of the article underlined that the majority of the capitalist gentry had belonged to Belarusian nation and had had local roots.*